(/ru/component/banners/click/14)
(/ru/component/banners/click/10)

Бярэзінская ПАНАРАМА

г. Березино, ул. Комсомольская, 27 (https://goo.gl/maps/iLC97P4ykwK8qoZZ9)
gazeta@b-panoram.by (mailto:gazeta@b-panoram.by)
+375-1715-6-92-71 (tel:+375171563217)

(/ru/component/banners/click/173)

Дзякуй, участковы міліцыянер

07.06.2022 redaktor1 (/ru/sotsialnaya-reklama/itemlist/user/365-redaktor1) 460



Нядаўна на адрас раённай міліцыі прыйшоў электронны зварот. Яго даслаў жыхар сталіцы Аляксандр Саўчук. Ён выказаў словы падзякі за прафесіяналізм і чуласць эміліцыянерам, якія двойчы прыходзілі яму на дапамогу ў цяжкую хвіліну. Асобна мужчына адзначыў участковага інспектара міліцыі Бярэзінскага РАУС Максіма Кашлачова. Ён 29 красавіка не прайшоў міма бяды сям'і з шасцігадовай дачушкай.

Па дарозе з Хоцімска ў сталіцу нечакана ў іх выйшаў са строю датчык узроўню паліва і каля аграгарадка Пагост машына надзейна заглохла без паліва. Набыць гаручае ні за якія грошы не атрымлівалася. Паблізу не было ні заправачнай станцыі, ні знаёмых, а дачушка пачала замярзаць у салоне машыны. Давялося звярнуцца па дапамогу да ўчастковага інспектара міліцыі, які ў гэты час знаходзіўся на пункце аховы правапарадку ў будынку Пагосцкага сельскага Савета. Ён не адмовіў, запрасіў у свой службовы аўтамабіль, "злятаў" за каністрай і даставіў паліва да машыны. Ад грашовай кампенсацыі міліцыянер катэгарычна адмовіўся. І падкрэсліў, што яму цалкам дастаткова слова "дзякуй".

Сам Максім Кашлачоў нічога асаблівага ў сваім учынку не бачыць

– Напэўна, кожны на маім месцы паступіў бы так, – гаворыць ён, – людзям жа трэба дапамагаць. І гэта не толькі таму, што я нашу міліцэйскі мундзір, але і па-чалавечы.

Службу ўчастковага інспектара міліцыі ён нясе ўжо другі год і заслужана карыстаецца павагай калег і кіраўніцтва міліцыі.

– Максім яшчэ з дзяцінства марыў пра навучальныя ўстановы МУС Рэспублікі Беларусь, – гаворыць пра Максіма Кашлачова намеснік начальніка РАУС **Генадзій Рабіза**, – ён са звычайнай сялянскай сям'і. Бацька ў яго адзін з лепшых земляробаў ААТ "Пагосцкі" з маленства прывучыў сына паважаць людзей, не цурацца ніякай працы. Будучы школьнікам, дапамагаў бацьку на жніве – працаваў памочнікам камбайнера. У акадэмію МУС Рэспублікі Беларусь паступаў свядома і без ваганняў пасля заканчэння вучобы вярнуўся на службу ў наш аддзел міліцыі.

Трэба сказаць, што Максім сам дабіўся для сябе прызначэння на адміністрацыйны ўчастак у родным аграгарадку Пагост.

– Мне падаецца, што менавіта тут сярод знаёмых, суседзяў і сваіх таварышаў я буду надзвычай патрэбны як абаронца іх інтарэсаў і ахоўнік іх спакою, – лічыць Максім. – Ведаю, гэта няпроста несці міліцэйскую службу сярод сваіх, але мяне гэта нікольк не палохае.

Максім і сапраўды жадае дапамагчы кожнаму на сваім участку.

– Ведаеце, куды прасцей падзяліцца з чалавекам палівам на дарозе, чым вярнуць труса бабулі, – гаворыць ён. – Магчыма яго не выкралі, а ён сам збег ад недагляду. Але жанчыне ад гэтага не лягчэй. Таму, пакуль гэта так, слоў падзякі да сябе ад людзей не папрашу.

Мілана ТРАПЯНОК.

Фота Алены ГРОМАВАЙ.

Источник: redaktor1 (/ru/sotsialnaya-reklama/itemlist/user/365-redaktor1)

Нашли ошибку? Выделите её и нажмите CTRL + ENTER

Добавить комментарий

Другие материалы в этой категории: « Чаму работніку пракуратуры патрэбен патрыятызм? (/ru/novosti/aktualnye-novosti/item/12298-chamu-rabotniku-prakuratury-patreben-patryyatyzm) Захаваць прыроду – усеагульная задача » (/ru/novosti/aktualnye-novosti/item/12296-zakhavats-pryrodu-useagulnaya-zadacha)

Лента новостей

Кто считается незанятым в экономике? (/ru/novosti/ofitsialno/item/32983-kto-schitaetsya-nezanyatym-v-ekonomike)

03.10.2024

Ставка на молодежь. Почему Президент второй раз за месяц пришел в студенческую аудиторию и о чем говорил (/ru/novosti/vazhnoe/item/32982-stavka-na-molodezh-pochemu-prezident-vtoroj-raz-za-mesyats-prishel-v-studencheskuyu-auditoriyu-i-o-chem-govoril)

03.10.2024

Купить продукты, узнать сельские новости, пообщаться с инспектором МЧС... (/ru/novosti/aktualnye-novosti/item/32981-kupit-produkty-uznat-selskie-novosti-poobshchatsya-s-inspektorom-mchs)

03.10.2024

Оригинальное предложение, помноженное на знание дела (/ru/novosti/obshchestvo/item/32980-originalnoe-predlozhenie-pomnozhennoe-na-znanie-dela)

03.10.2024

Спасибо учитель (/ru/novosti/obrazovanie/item/32979-spasibo-uchitel)

03.10.2024

Все Новости (/ru/novosti)

Подписка



(http://www.berezino.by/padpisnaya-kampaniya/)

Календарь

« (/index.php?option=com_k2&view=itemlist&task=calendar&month=9&year=2024&Itemid=811) Октя

Пн	Вт	Ср
	1 (/ru/sotsialnaya-reklama/itemlist/date/2024/10/1)	2 (/ru/sot reklama/itemlist/
7	8	9
14	15	16
21	22	23
28	29	30

© 2021 Березино. Березинский район. Березинская панорама. Все права защищены. Разработка: Группа компаний "ЦВР-Октябрьский"

(/ru/component/banners/click/14) (/ru/component/banners/click/10) (/ru/component/banners/click/12)
(/ru/component/banners/click/15)
(/ru/component/banners/click/186) (/ru/component/banners/click/185)

1086 (https://metrika.yandex.ru/stat/?id=87748660&from=informer)